Опубликовано: 24 ЯНВАРЯ 11:17

# Презентация Молодежных послов ЦУР прошла в Минске

**Торжественная церемония награждения и присвоения звания Молодежный посол Целей устойчивого развития состоялась в рамках проводимого сегодня в Минске первого Национального форума по устойчивому развитию.**




Дипломы Молодежных послов ЦУР молодым людям вручили заместитель председателя Совета Республики Национального собрания Беларуси Марианна Щеткина и министр образования Игорь Карпенко.

Напомним, в Беларуси у каждой из 17 Целей устойчивого развития есть свой личный посол из числа студентов. Все они - победители конкурса "Молодежные послы Целей устойчивого развития - будущее планеты в наших руках", итоги которого подвели недавно в Республиканском молодежном

- Боровиков Максим, Белорусская государственная орденов Октябрьской Революции и Трудового Красного Знамени сельскохозяйственная академия;
- Боровцов Илья, Гомельский государственный университет имени Ф.Скорины;
- Господарёва Валерия, Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина;
- Дорошенко Екатерина, Гродненский государственный университет имени Я.Купалы;
- Илларионова Илона, Белорусский государственный университет культуры и искусств;
- Ковалевская Валерия, Белорусский государственный экономический университет;
- Кулакова Евгения, Витебский государственный университет имени П.М. Машерова;
- Курасова Лариса, Белорусский государственный технологический университет;
- Маварди Аиша, Международный университет "МИТСО";
- Песоцкий Давид, Белорусская государственная академия авиации;
- Петрусевич Виталина, Белорусский государственный университет;
- Полонская Екатерина, Минский государственный лингвистический университет;
- Проскурина Валерия, Белорусский государственный университет;
- Святоха Станислав, Белорусский институт правоведения;
- Толстик Виктор, Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники;
- Шилко Светлана, Белорусский государственный педагогический университет имени М.Танка;
- Шишко Владислав, Гродненский государственный медицинский университет.

Портал sb.by присоединяется к поздравлениям и желает всем участникам продуктивной работы в реализации своих идей, проектов и программ.

ЦУР МОЛОДЕЖЬ

Максим ОСИПОВ Автор фото: Александр КУШНЕР
Написать автору

3.67

Опубликовано: 09:30

# Число жертв наводнения в Индонезии возросло до 59

**Число погибших в результате сильнейшего наводнения в индонезийской провинции Южный Сулавеси увеличилось до 59. Об этом сегодня проинформировали в местном подразделении агентства по предотвращению стихийных бедствий, пишет AFP.**



Сообщается также, что еще 25 человек числятся как пропавшие без вести, а свыше 3 тысяч местных жителей были вынуждены оставить свои дома.

Ранее сообщалось о том, что стихийное бедствие унесло жизни 30 человек.

К наводнению привели ливни, из-за которых пришлось открыть дамбу, находящуюся примерно в 30 километрах от города Макасар. Глава поселения Гова подчеркнул, что на эти меры пришлось пойти, так как сдерживание потоков воды могло привести к еще более разрушительным последствиям.

ИНДОНЕЗИЯ СТИХИЙНОЕ БЕДСТВИЕ НАВОДНЕНИЕ

Подготовил(а): Юрий БАКЕРЕНКО Автор фото: РЕЙТЕР

Написать автору

☆ ☆ ☆ ☆ ☆

Опубликовано: 09:27 ☆☆☆☆☆

ИСТОЧНИК: ГАЗЕТА «РЭСПУБЛІКА» Рэспубліка

# Сцяна просіць падтрымкі

## Жемчужина позднего барокко в Зембине: райисполком ищет деньги на ее возрождение

**Сёння гэта карціна наводзіць на роздум. Фрагменты заснежаных сцен, фасадная частка з вобразам Дзевы Марыі і надпісам, які, на жаль, поўнасцю ўжо не чытаецца, крыж на франтоне. Там побач нават ёсць магілкі, дзе спачываюць прадстаўнікі шэрагу мясцовых шляхецкіх родаў. Старыя муры касцёла Ушэсця Найсвяцейшай Дзевы Марыі, што знаходзіцца ў аграгарадку Зембін Барысаўскага раёна, чакаюць свайго часу кансервацыі і рэстаўрацыі. На месцы пабывала карэспандэнт «Рэспублікі».**



## **Ад Жэмбіна да Зембіна**…

Сучасны аграгарадок — адно з найстарэйшых паселішчаў Барысаўшчыны. Першая згадка пра яго ў пісьмовых крыніцах адносіцца да 1526 года. Сярэднявечныя картографы пісалі слова «Жембін» на карце Рэчы Паспалітай яшчэ ў XVI стагоддзі. Не лічачы свайго заснавальніка — міфічнага князя Жабы, Зембін на працягу стагоддзяў належаў знакамітым магнацкім родам. Радзівілы, Кішкі і Саковічы, Патоцкія і Война-Ясенецкія, Храптовічы — гэта зусім няпоўны пералік прозвішчаў, якія пакінулі след у гісторыі паселішча.



Чаго толькі не давялося перажыць мястэчку з яго найцікавейшымі архітэктурнымі помнікамі. Калі б было рэальна іх узнавіць, упэўнена, сённяшні Зембін з насельніцтвам 600 жыхароў заззяў бы новымі колерамі,ператварыўся ў яркую турыстычную кропку на маршруце падарожнікаў і гасцей краіны. Справа ў тым, што тут пэўны час мірна ўжываліся праваслаўныя, каталікі і іўдзеі. І ўсім хапала месца. Для людзей розных веравызнанняў дзейнічалі тры святыні: Свята-Міхайлаўская царква, якая адноўлена ў нашы дні, сінагога (і, кажуць, нават не адна) і каталіцкі касцёл. Але напаткаў гэтыя будынкі, як і людзей, што прыходзілі ў іх пагаварыць з Богам, трагічны лёс. Яўрэйства было старанна знішчана немцамі падчас Вялікай Айчыннай вайны. Засталіся ўспамінам аб іх могілкі і стары будынак

іўдзейскай міквы. І, на вялікі жаль, неверагодная колькасць пакут выпала на лёс дамініканскага касцёла.



## Мы яго губляем?

Гісторыю гэтага гісторыка-культурнага аб'екта, які зараз па дакументах з'яўляецца астанкамі былога дамініканскага касцёла другой катэгорыі, шчаслівай не назавешь. Спачатку ён быў драўляным: у 1640 годзе Адам Мацей Саковіч з жонкай Марыяй заснавалі тут дамініканскі манастыр з бібліятэкай і школай. У 1790 годзе драўляны касцёл згарэў, і толькі праз 20 гадоў (у 1809-м) на яго месцы ўзведзены новы цагляны будынак.

Шмат было страшнага, крывавага. Войны 1812 года, Першая і Другая сусветныя, розныя набегі, закрыццё кляштара ў 1833 годзе і самога касцёла ў 1933-м... Цікава, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны касцёл атрымаў нязначныя пашкоджанні, а ў мірны час сербануў ліха. Да 1980-х гадоў будынак былога касцёла выкарыстоўваўся як збожжасховішча і склад хімікатаў. Калі ж наогул абваліўся дах, будынак паступова пачаў ператварацца ў руіну.

На фундаменце і сценах бачым шматлікія расколіны.



**Іна Сайчык, галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Барысаўскага выканкама,** адзначае:

*— Наш зембінскі касцёл, як гісторыка-культурная каштоў-насць рэспубліканскага ўзроўню, сёння агароджаны. Яны маюць ахоўную дошку і тэхнічны пашпарт. Уласнік – Зембінскі сельскі выканаўчы камітэт – ажыццяўляе пастаянны догляд, каб забяспечыць належны санітарны стан аб'екта. За кошт уласных сродкаў Барысаўскага райвыканкама на гэты год запланавана праектаванне зон аховы аб'екта. Мы вялі перапіску з Мінкультуры, праектным філіялам ААТ «Белрэстаўрацыя» і ГА «Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры» па пытаннях навуковага даследавання і распрацоўкі праектнай дакументацыі на правя-дзенне супрацьаварыйных работ і кансервацыю. Аднак, калі даведаліся, колькі гэта каштуе, справа прыпынілася. Уявіце, на старыя недэнамінава-ныя грошы каля 800 мільёнаў рублёў. Сёння ў сувязі з адсутнасцю фінансавання правядзенне тэхнічнага абследавання руін адкладзена.*

Над статуяй Дзевы Марыі і вакол крыжа сёння буслянка... «Значыць, нездарма так ахвотна белыя птушкі штогод тут гняздуюцца», — кажуць мясцовыя жыхары с надзеяй на адраджэнне касцёла. Атмасфера ў Зембіне светлая, нягледзячы на песімізм спецыялістаў, якія даследуюць аб'ект рэлігійнай культуры. Ну так, Зембін старыцца, супольнасць каталікоў невялікая. У руінах касцёла з-за расколін (на сценах, у фундаменце і інш.) праблемна нават ажыццявіць кансервацыю сучаснымі будаўнічымі матэрыяламі. Гэта можа нанесці помніку страты яшчэ большыя. Прагматыкі лічаць, што прасцей і танней было б пабудаваць новы касцёл. А па законе помнік гісторыка-культурнай спадчыны спецыяльна руйнаваць нельга. Заходнія навукоўцы і рэстаўратары наогул раяць не чапаць гэты апошні помнік архітэктуры позняга барока ў краіне.



Эх, дзе дастаць тыя самыя нікчэмныя грашовыя знакі дзеля сапраўды каштоўнага? Марыя з зембінскага касцёла моўчкі глядзіць на нас, сучасных, са сціплай усмешкай.

Райвыканкам і жадаў бы выратаваць унікальны аб`ект, які з'яўляецца апошнім культавым збудаваннем барока, узведзеным у эпоху класіцызму, але знайсці грошы не так проста. Можа, іх хопіць на рэстаўрацыю і кансервацыю?

shimuk@sb.by **Полная перепечатка текста и фотографий запрещена. Частичное цитирование разрешено при наличии гиперссылки.**

ДОСТОПРИМЕЧАТЕЛЬНОСТИ ПАМЯТНИК АРХИТЕКТУРЫ РЕСТАВРАЦИЯ КОСТЕЛ

Татьяна ШИМУК
Написать автору

Обращение в редакцию
Контакты
Подписка
Рекламные игры
Фотоконкурс
Новости компаний
Аукционы
Программа тв
Проверка билета

© Беларусь Сегодня, 1998- 2019.
Все права принадлежат Издательскому дому «Беларусь сегодня»